Праца транспарту на свята

СТАР. 3

Хто вінаваты ў крызісе?

СТАР. 5

5 спосабаў выратавання бульбы

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЛІПЕНЯ 2015 г. СЕРАДА № 123 (27981) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПАСТАНОВА ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб прызначэнні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

У адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 81 і пунктам 3 часткі першай артыкула 97 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, пунктам 1 артыкула 23 і часткай першай артыкула 56 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прызначыць выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 11 кастрычніка 2015 года.

2. Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў арганізаваць у адпаведнасці са сваімі паўнамоцтвамі правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і ажыццяўляць кантроль за выкананнем заканадаўства аб выбарах.

3. Дзяржаўным органам, іншым арганізацыям забяспечыць выкананне аднесеных да іх кампетэнцыі арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у тэрміны, вызначаныя Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

4. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечыць фінансаванне выдаткаў на падрыхтоўку і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на гэтыя мэты.

5. Гэта Пастанова ўваходзіць у сілу з дня яе афіцыйнага апублікавання.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. АНДРЭЙЧАНКА

30 чэрвеня 2015 г., г. Мінск.

ДАТА ВЫБАРАЎ ЗАЦВЕРДЖАНА

На апошнім пасяджэнні сёмай сесіі Палата прадстаўнікоў падтрымала прызначэнне даты правядзення выбараў прэзідэнта краіны на 11 кастрычніка гэтага года. Як заўважыла ў сваім выступленні перад дэпутатамі старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына, традыцыйна выбары праходзяць не ў апошнюю магчымую па заканадаўстве нядзелю, а крыху раней.

Падчас свайго выступлення Лідзія Ярмошына нагадала, што на гэтых выбарах будзе выкарыстоўвацца такое новаўвядзенне, як фінансаванне перадвыбарных кампаній кандыдатаў за кошт іх фондаў.

— Для гэтага павялічваецца ў тры разы гранічны памер выбарчага фонду кандыдата ў прэзідэнты з 3 да 9 тысяч базавых велічынь, — паведаміла старшыня ЦВК. — На сёння гэта сума складае 1 мільярд 620 мільёнаў рублёў, або прыкладна 105 тысяч долараў.

Пры гэтым ліквідавана абмежаванне памеру грашовых сродкаў, якія можа ўнесці ў фонд сам прэтэндэнт на прэзідэнцкую пасаду. Па словах Лідзіі Ярмошынай, цяпер кандыдат зможа цалкам за кошт сваіх уласных сродкаў прафінансаваць «увесь выбарчы фонд, усю сваю агітацыйную кампанію». Раней ён мог уносіць у асабісты фінансавы фонд не больш за 50 базавых велічынь. Старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў паведаміла, што фонды дазволена фарміраваць ужо з моманту рэгістрацыі ініцыятыўных груп для фінансавання выдаткаў па збору подпісаў.

— Падобныя новаўвядзенні, што даюць больш шырокія магчымасці для фінансавання ўласнай выбарчай кампаніі, прывядуць да легалізацыі многіх выдаткаў, якія нясуць кандыдаты альбо патэнцыйныя кандыдаты, — патлумачыла старшыня ЦВК.

Лідзія Ярмошына таксама выказала спадзяванні, што выбарчая кампанія будзе «не сумнай», але пры гэтым «не даставіць турбот і ўзрушэнняў, якія мы мелі ў 2010 годзе».

На пытанне, якую ацэнку будучым выбарам можа даць Захад у асобе назіральнікаў, Лідзія Ярмошына адказала, што застаецца толькі верыць у лепшае і «працаваць над тым, каб не даваць падстаў для крытыкі».

Як паведаміла старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні дзяржаўных рэферэндумаў, рэгістрацыя ініцыятыўных груп па зборы подпісаў для вылучэння кандыдатаў павінна завяршыцца не пазней за 22 ліпеня. Збор подпісаў будзе працягвацца з 23 ліпеня па 21 жніўня. Не пазней за 22 ліпеня будуць створаны тэрытарыяльныя выбаркамы, а да 26 жніўня — участковыя. З 22 жніўня па 5 верасня трэба будзе падаць у ЦВК дакументы на рэгістрацыю кандыдатаў. Не пазней за 5 верасня абласныя і Мінская гарадская камісіі падвядуць вынікі збору подпісаў па кожнай кандыдатуры на сваіх тэрыторыях і пададуць гэтыя вынікі ў Цэнтрвыбаркам. Рэгістрацыя кандыдатаў на пасаду прэзідэнта павінна завяршыцца не пазней за 15 верасня.

— З гэтага моманту пачынаецца перыяд перадвыбарнай агітацыі, — дадала Лідзія Ярмошына.

Датэрміновае галасаванне пройдзе з 6 па 10 кастрычніка.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

Інтэрв'ю з Лідзіяй Ярмошынай аб падрабязнасцях перадвыбарнай кампаніі чытайце на 3-й старонцы.

ПРАКАВЕТНАЕ

«ЗАЙГРАЙ, СОНЦА!..»

У дні летняга сонцастаяння на нашай зямлі спрадвеку адзначалі Купалле — кульмінацыю гадавога кола, момант найвышэйшага росквіту прыродных сіл. Яго ўрачыста і весела святкавалі і моладзь, і старыя, радаваліся дням, калі кветкі валодаюць гаючымі ўласцівасцямі, і начам, поўным таямніц. У гэтыя купальскія вечары і ночы трэба паліць агонь і сустракаць світанак, назіраць, як «грае» сонца.

«Сягоння Купала,
Заўтра Ян!
Зайграй, сонца!
Зайграй нам!..»

У аграгарадку Ракаў пад Мінскам традыцыя адзначаць Купалу заведзена даўно. І ў нашы дні яна таксама працягваецца. Энтузіясты шчыруюць, стараюцца, каб, не дай Бог, яна не перарывалася, доўжылася і нагадвала ўсім і пра нашы карані, культуру, самабытнасць. Кожны год на Бярозе Ісларчы збіраюцца сапраўдныя знаўцы купальскіх песень і з ахвотай прымаюць удзел у гэтым відовішчным ігрышчы. Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алег Белы і Паліна Кураповіч (на фота) — будучыя педагогі па народнай культуры і абрадах, таксама сустракалі самае адметнае летняе свята.

СТАР. 3

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах:

«Цярпімае стаўленне да лжэпрадпрымальніцкіх структур скажае нармальныя ўмовы канкурэнцыі добрасумленных удзельнікаў рынку. Таму бізнес-супольнасць павінна не менш, чым органы дзяржаўнага кіравання, клапаціцца, каб такіх структур наогул не было. Замест гэтага мы часта назіраем з боку бізнес-супольнасці даволі лаяльнае стаўленне. Наша пазіцыя такая, што не толькі ўзаемаадносіны, але нават думкі аб узаемаадносінах суб'ектаў гаспадарання з такімі лжэструктурамі павінны ўсяляць жах. У гэтым выпадку лепш перастрахавацца, чым недастрахавацца».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.07.2015 г.

Долар ЗША	15333,00	▼
Еўра	17110,00	▲
Рас. руб.	274,89	▼
Укр. грыўня	730,14	▲

ГАЛОЎНАЯ МЭТА — КЛОПАТ АБ ЧАЛАВЕКУ

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Мясніковіча М.У. на закрыцці дзявятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання

Паважаныя вышэйшыя службовыя асобы краіны!

Паважаныя члены Савета Рэспублікі і запрошаныя!

Сёння завяршае работу дзявятая сесія Савета Рэспублікі пятага склікання. Мы падводзім пэўныя вынікі работы і намячаем задачы, якія неабходна вырашыць у 2015 годзе, у тым ліку ў міжсесійны перыяд.

За мінулы перыяд Савет Рэспублікі, яго пастаянныя камісіі мэтанакіравана працавалі не толькі над нарматыўным прававым забеспячэннем дзейнасці дзяржавы, але з'явіліся і новыя формы ўзаемадзеяння з дэпутацкім корпусам мясцовых Саветаў, рэгіёнамі. Больш канкрэтным стаў удзел членаў Савета Рэспублікі ў разглядзе пытанняў прадпрыемстваў, міжнароднай дзейнасці, што пазітыўна ўплывае на заканатворчую дзейнасць. Але гэта толькі пачатак. Наперадзе вельмі шмат адказных і, я сказаў бы, стратэгічна важных задач.

На завяршальнай стадыі распрацоўкі праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гады. Пастаянныя камісіі, кіраўніцтва Савета Рэспублікі, усе сенатары павінны актыўна ўключыцца ў работу, праводзімую ўрадам.

СТАР. 2

КУРСАМ НА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЭКАНАМІЧНАЙ І САЦЫЯЛЬНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанкі У.П. на закрыцці сёмай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання

Паважаныя дэпутаты, запрошаныя і журналісты!

Сёмая сесія Палаты прадстаўнікоў завяршае сваю работу. Яна азнаменавалася шэрагам важных палітычных падзей, ключавой з якіх, безумоўна, стала пасланне кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і парламенту.

Сумленная і адкрытая размова, што адбылася ў Авальнай зале, абумовіла характар тых прыярытэтных задач, якімі кіруюцца сёння ўсе органы ўлады ў забеспячэнні эканамічнай і сацыяльнай стабільнасці.

Базавы тэзіс кіраўніка дзяржавы аб тым, што менавіта ў эканоміцы гарантыя нашай незалежнасці, залог міру і фундамент будучага, лёг у аснову нашай заканадаўчай дзейнасці.

У ходзе сесіі разгледжана каля 90 законапраектаў, звыш 60 з якіх — у другім чытанні.

З улікам патрабаванняў часу прыняты меры па ўмацаванні фінансавага сектара і банкаўскай сістэмы, паляпшэнні інвестыцыйнага клімату. На захаванне традыцыйных і пошук новых рынкаў збыту беларускіх тавараў была накіравана актыўная работа па ўстараненні бар'ераў паміж краінамі Еўразійскага эканамічнага саюза і развіцці біржавага гандлю.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Данія арганізуе кантроль на мяжы з Германіяй

Данія ўвядзе кантроль на мяжы з Германіяй для таго, каб спыніць уезд на сваю тэрыторыю нелегальных мігрантаў і перавозку кантрабандных тавараў. Пра гэта міністр замежных спраў Даніі Крысціян Джэнсан заявіў свайму нямецкаму калегу Франку Штайнмайеру. Па словах Джэнсана, абмежавальныя захады будуць уведзены ў адпаведнасці з правіламі, вызначанымі ў краінах шэнгенскай зоны. У 2011 годзе Капенгаген на некалькі месяцаў увёў кантроль на мяжы з Германіяй. Тады памежнікі атрымалі права аглядаць аўтамабілі, якія ўязджаюць у Данію. Гэтая мера выклікала незадаволенасць у Бруселі.

Грэкі выступілі супраць еўракрэдытораў

Тысячы дэманстрантаў у Грэцыі выступілі супраць прапаноў міжнародных крэдытораў, паведамляюць інфармагенцтвы. Удзельнікі акцый у Афінах і Салоніках падтрымалі ўрад краіны. Грэкі прыйшлі на мітынг з транспарантамі «Не» — мемарандуму», «Не» — шантажу», «Наша жыццё не належыць крэдыторам». Як паведамлялася раней, у Грэцыі на 5 ліпеня прызначаны рэферэндум аб неабходнасці ўвядзення мер эканоміі, на якіх настойвае «вялікая тройка» крэдытораў — Еўракамісія, Еўрапейскі цэнтральны банк і Міжнародны валютны фонд. Прэм'ер Цыпрас заклікаў грамадзян краіны галасаваць супраць. У сувязі з абвяшчэннем рэферэндуму ў апошнія дні рэзка вырас адток сродкаў з рахункаў, у многіх банкаматах скончыліся грошы. Акрамя гэтага, да канца чэрвеня Афіны павінны былі выплаціць МВФ каля 1,6 млрд еўра ці абвясціць дэфолт.

Туніс адмяняе падатак на выезд для турыстаў

Улады Туніса адмяняюць падатак на выезд замежнікаў-нерэзідэнтаў, у тым ліку турыстаў, з краіны. Пра гэта паведаміла туніскі міністр турызму Сэльма Элумі Рэкік. Сума гэтага плацяжу, які быў уведзены восенню 2014 года, складала 30 туніскіх дынараў (прыкладна $15,78). Па словах Рэкік, урон ад тэракта ў Сусе складзе каля $515 млн. Улады Туніса прынялі шэраг экстранных захадаў для выратавання турыстычнага сезона. У прыватнасці, яны адмянілі візы для грамадзян Беларусі, Казахстана, Кіпра і шэрагу афрыканскіх краін. Грамадзяне КНР, Індыі, Ірана і Іарданіі змогуць атрымаць уязныя візы проста ў аэрапортах.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У авіякатастрофе ў Інданезіі загінулі 113 чалавек

На борце ваенна-транспартнага самалёта «Геркулес» С-130, які разбіўся на поўначы вострава Суматра, было 113 чалавек. Пра гэта паведаміла агенцтва Franse-Presse са спасылкай на прадстаўнікоў кіраўніцтва ўзброеных сіл Інданезіі. Ніхто не выжыў. Самалёт пацярпеў катастрофу ўчора праз некалькі хвілін пасля ўзлёту з базы ВПС на поўначы вострава Суматра. На месцы падзення «Геркулеса» паблізу горада Медан успыхнуў магутны пажар. Па сведчанні відавочцаў, самалёт выбухнуў проста над дахам гасцініцы. Пры падзенні ён зачапіў некалькі жылых будынкаў і аўтамабіляў.

КАРАТКА

Міністэрства гандлю да 5 ліпеня праверыць, як гандлёвыя аб'екты і аб'екты грамадскага харчавання выконваюць новыя правілы гандлю тытунёвымі вырабамі.

Салют у гонар Дня Незалежнасці Беларусі пройдзе 3 ліпеня ва ўсіх абласных цэнтрах краіны, а таксама ў Брэсцкай крэпасці. Пачнецца ў 23.00.

З 1 ліпеня спынены прыём банкнотаў наміналам Br50 узору 2000 года пры ўсіх відах плацяжоў. 1 ліпеня 2015 года банкі і суб'екты гаспадарання спыняць выдачу названых банкнотаў фізічным асобам, у тым ліку і ў якасці здачы. Пры гэтым прыём банкнотаў наміналам Br50 банкамі ад суб'ектаў гаспадарання будзе ажыццяўляцца да 1 верасня бягучага года.

У сувязі з учыненым у Тунісе тэрарыстычным актам Міністэрства замежных спраў Беларусі рэкамендуе беларускім грамадзянам, якія знаходзяцца ў гэтай краіне, выконваць максімальна магчымыя меры засцярогі і ўстрымацца ад наведвання месцаў масавага збору людзей.

■ Прамая лінія

НАМ НЕ «ДА ЛЯМПАЧКІ»

Расход электраэнергіі бытавых прыбораў класаў А і В можа адрознівацца больш чым у 2,5 раза

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Жыць багата — гэта не абавязкова атрымліваць самы высокі заробак. Рацыянальная аптымізацыя сваіх расходаў таксама робіць чалавека заможным. Гэта тычыцца і ўсёй нашай краіны. Не маючы вялікіх прыродных рэсурсаў і крыніц энергіі, Беларусь імкнецца правільна размяркоўваць і эфектыўна спажываць усё — і ваду, і газ, і электраэнергію. За гэтым сочыць адпаведны дзяржаўны орган — Дэпартамент па энергаэфектыўнасці. Сёння ён добра вядомы ў краіне як самастойнае структурнае падраздзяленне Дзяржстандарта. Дэпартамент рэалізуе дзяржаўную палітыку ў галіне энергазберажэння і аднаўляльных крыніц энергіі. Акрамя гэтага, ажыццяўляе нагляд за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў.

Дэпартамент па энергаэфектыўнасці вядзе статыстыку з 1997 года. Валавы ўнутраны прадукт краіны за гэты час вырас больш, чым у 2,5 раза, а спажыванне паліўна-энергетычных рэсурсаў практычна засталося на ўзроўні 1997-га — рост 6-7%. Аднак эканомяць не толькі прадпрыемствы і арганізацыі. Агульны вынік залежыць і ад кожнага жыхара краіны. Як не выкідаць грошы на вецер пры ацяпленні кватэры? Па якіх характарыстыках выбіраць энергазберагальныя лямпачкі? Як гатаваць ежу эканомна? На гэтыя і іншыя пытанні падчас «прамой лініі» ў нашай газеце адказаў намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Сяргей СЯМАШКА.

СТАР. 6

■ Парламенцкі дзённік

СЕНАТАРЫ РАЗГЛЕДЗЕЛІ 25 ПЫТАННЯЎ

«Мы падводзім пэўныя вынікі работы і ставім задачы, якія неабходна вырашыць у 2015 годзе, у тым ліку ў міжсесійны перыяд», — такімі словамі распачаў дзявятую сесію Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі яго старшыня Міхаіл Мясніковіч.

Учора сенатары ратыфікавалі дагавор аб далучэнні Кыргызскай Рэспублікі да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе.

«Далучэнне Кыргызстана адпавядае інтарэсам Рэспублікі Беларусь і нашаму агульнаму саюзу. І, зразумела, гэта даволі адчувальна ўзмацніла нашы двухбаковыя кантакты», — сказаў **Аляксандр МІХНЕВІЧ, першы намеснік міністра замежных спраў.**

Члены Савета Рэспублікі ўхвалілі ратыфікацыю дагавора, але ў Міхаіла Мясніковіча ўзніклі пытанні наконт бяспекі адкрыцця межаў паміж Кыргызстанам і Казахстанам, бо гэта пагражае наплывам танных тавараў з трэціх краін. Але Аляксандр Міхневіч запэўніў сенатараў, што гэта не нашкодзіць рынку і бяспецы ЕАЭС і Беларусі ў прыватнасці, а толькі прынясе карысць. Па яго словах, пакуль мяжа закрыта.

Асаблівую зацікаўленасць у сенатараў выклікаў законапраект «Аб барацьбе з карупцыяй». Згодна з ім будзе ўдасканальвацца парадак дэкларавання даходаў дзяржаўных службовых асоб для ўстанаўлення іх рэальнага маёмаснага становішча. «Пашыраецца пералік звестак, якія ўказваюцца ў дэкларацыі», — дадае **генеральны пракурор Беларусі Аляксандр КАНЮК.** Такім чынам прадухіляецца подкуп чыноўнікаў шляхам дачы ім у карыстанне матэрыяльных каштоўнасцяў.

Таксама, згодна з законапраектам, устаноўлена забарона на паўторны прыём на дзяржслужбу асоб, якія раней былі звольнены па абставінах, якія іх дыскрэдытавалі. Уводзіцца механізм вяртання ў даход дзяржавы незаконнага ўзбагачэння, атрыманага дзяржаўнай службовай асобай. Цяпер адказнасць за ажыццяўленне працэдур дзяржзакупак службовыя асобы будуць несці персанальна.

Падчас сесіі было разгледжана і ўхвалена 25 пытанняў, якія датычацца бюджэтнай, ваеннай ды іншых сфер, а таксама міжнароднага супрацоўніцтва з Малдовай, ЗША і СНД. Міхаіл Мясніковіч скончыў мерапрыемства завяршальнай падсумавальнай прамовай.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

ВУЧАЦЦА ЗАРАБЛЯЦЬ ГРОШЫ

Урад адказаў на пытанні парламентарыяў па рэалізацыі сацыяльнай палітыкі

Учора адбылося сумеснае пасяджэнне абедзвюх палат парламента — Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Пасля даклада намесніка прэм'ер-міністра Наталлі Качанавай, прысвечанага рэалізацыі сацыяльнай палітыкі ў нашай краіне, дэпутаты і сенатары задалі ёй, а таксама іншым прадстаўнікам урада, свае пытанні.

МЕДЫЦЫНА — НА СУСВЕТНЫМ УЗРОЎНІ

— На працягу апошніх гадоў сацыяльная сфера была не толькі спажыўцом бюджэтных сродкаў, але і сама стала дастаткова важкай крыніцай іх папаўнення, — адзначыла Наталля Качанава на пачатку свайго выступлення. — Толькі за мінулыя чатыры гады гэтай пяцігодкі арганізацыямі адукацыі, аховы здароўя, культуры, фізічнай культуры і спорту, здраўніцамі нашай краіны атрымана даходаў на суму, якая перавышае 33 трыльёны рублёў.

Як падкрэсліла выступоўца, клопат пра здароўе грамадзян — найважнейшы нацыянальны прыярытэт нашай дзяржавы.

— На развіццё медыцыны накіроўваюцца значныя рэсурсы: не менш за 4% ВУП штогод, — праінфармавала намеснік прэм'ер-міністра. — Гэта дазваляе дынамічна развіваць галіну. За чатыры гады гэтай пяцігодкі на будаўніцтва і рэканструкцыю аб'ектаў аховы здароўя накіравана 4,5 трыльёна рублёў, што дазволіла забяспечыць увод больш як 100 аб'ектаў.

Як паведаміла Наталля Качанава, па даручэнні кіраўніка дзяржавы ў жніўні гэтага года будзе ўведзена ў эксплуатацыю малекулярна-генетычная лабараторыя канцэрагенэзу, да канца бягучага года завершана рэалізацыя найважнейшага для сферы аховы здароўя краіны праекта па стварэнні Рэспубліканскага цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі.

— Многія віды спецыялізаванай высокатэхнічнай медыцынскай дапамогі сталі звычайнай практыкай у рэгіёнах, — канстатавала Наталля Качанава. — Гэта кардыяхірургічныя ўмяшанні, эндапратэзаванне суставаў, аперацыі пры пухліне галаўнога і спіннога мозга. За апошнія гады айчынная медыцына сапраўды выйшла на якасна новы ўзровень, што пацвярджаюць аўтарытэтныя міжнародныя эксперты. Наша краіна займае адно з вядучых месцаў па даступнасці для насельніцтва медыцынскіх паслуг, а па эфектыўнасці сістэмы аховы здароўя — 42-е месца, апярэджваючы Злучаныя Штаты і Расійскую Федэрацыю.

Гаворачы пра дасягненні дэмаграфічнай палітыкі, Наталля Качанава звярнула асаблівую ўвагу на тое, што ўпершыню за апошнія дваццаць гадоў летась адбыўся прырост насельніцтва.

— Безумоўна, значная роля ў гэтым пакуль належыць міграцыйнаму складніку, але ўжо асобныя рэгіёны выходзяць на натуральны прырост. Істотна знізіўся тэмп натуральнага змяншэння насельніцтва: з 70 тысяч у 2003 годзе да 3 тысяч у 2014-м.

«Наша краіна займае адно з вядучых месцаў па даступнасці для насельніцтва медыцынскіх паслуг, а па эфектыўнасці сістэмы аховы здароўя — 42-е месца, апярэджваючы Злучаныя Штаты і Расійскую Федэрацыю».

Па інфармацыі, агучанай намеснікам прэм'ер-міністра, у 2014 годзе на свет з'явілася самая вялікая колькасць дзяцей за гады нашага суверэнітэту — 118,5 тысячы.

— Станоўчыя тэндэнцыі захоўваюцца і сёлета. Што важна: 52% народжаных дзяцей — гэта другія і наступныя дзеці ў сям'і.

У ТРЭНДЗЕ — АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ САДКІ

Закранаючы тэму дашкольнай адукацыі і, у прыватнасці, даступнасці дзіцячых садкоў, намеснік прэм'ер-міністра падкрэсліла, што «пытанні даступнасці могуць вырашацца, і ўжо часткова вырашаюцца, за кошт больш актыўнага выкарыстання альтэрнатыўных формаў».

— Гэта размяшчэнне дзіцячых садкоў на першых паверхах жылых будынкаў, адкрыццё груп каротказтэрміновага знаходжання, стварэнне садкоў сямейнага тыпу, — патлумачыла выступоўца. — Эфектыўнасць відавочная. З найменшымі дзяржаўнымі выдаткамі забяспечваецца той жа сацыяльны стандарт.

Акрамя таго, віцэ-прэм'ер паведаміла, што для вырашэння праблемы крокавай даступнасці дзіцячых садкоў у найбліжэйшыя 4 гады будзе пабудавана 38 новых устаноў дашкольнай адукацыі, у тым ліку 10 плануецца ўвесці ў строй ужо ў 2015 годзе. Наталля Качанава адзначыла, што ўзвядзенне новых дзіцячых садкоў павінна быць старанна спланавана з увязкай горадабудаўнічай палітыкі ў рэгіёнах, а таксама неабходна ўлічваць доўгатэрміновыя перспектывы нараджальнасці.

ЁСЦЬ СТЫМУЛЫ НАРАДЖАЦЬ

Аксана НЯХАЙЧЫК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, задала пытанне пра дапамогу маладым сем'ям. Дэпутат звярнула ўвагу на той факт, што сёння большасць сем'яў у краіне маюць толькі адно або двое дзяцей, і пацікавілася мерамі захвочвання сем'яў для нараджэння наступных дзяцей. Таксама парламентарый пацікавілася, ці магчыма ў нашай краіне ўвядзенне Ордэна бацькоўскай славы, як гэта зроблена ў суседняй Расіі, або іншай узнагароды для бацькі.

Наталля Качанава, адказваючы на пытанне, заўважыла, што ў нашай краіне прадугледжваецца матэрыяльная дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці, пры нараджэнні другога маці атрымлівае дапамогу і на немаўля, і на тое дзіця, якое яна нарадзіла раней. Акрамя таго, як адзначыла намеснік прэм'ер-міністра, сем'і, што выхоўваюць дваіх непаўналетніх дзяцей, маюць права на дзяржаўную падтрымку пры будаўніцтве жылля.

Адказваючы на другую частку пытання — наконт ордэна для бацькі, намеснік прэм'ер-міністра не выключыла з'яўлення ў будучыні такой узнагароды.

У 2014 годзе на свет з'явілася самая вялікая колькасць дзяцей за гады нашага суверэнітэту — 118,5 тысячы.

Ала СОПІКАВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы, пацікавілася, ці кантралюецца змест і праграма экскурсій за мяжу, што арганізоўваюцца для непаўналетніх жыхароў нашай краіны прыватнымі кампаніямі.

— Хто кантралюе, чаму будуць вучыцца нашы дзеці, напрыклад, на курсах па вывучэнні замежнай мовы ў краіне-носьбіце гэтай мовы? Ці можна арганізаваць дзяржаўны кантроль за зместам наведвання замежных краін нашымі дзецьмі і моладдзю? — спытала парламентарый.

— Натуральна, магчыма, — упэўнена Наталля Качанава. — Зусім нядаўна мы правялі міжведамасны савет па турызме, дзе разглядалі пытанні, што сёння тычацца ў тым ліку і выезду нашых турыстычных груп за мяжу. Я лічу, што калі непаўналетнія ў арганізаванай групе збіраюцца за мяжу, то, несумненна, тут павінен быць жорсткі кантроль за тым, якая мэта гэтай паездкі.

Алена ШАМАЛЬ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, спытала пра арганізацыю працы інвалідаў.

— У сваім дакладзе вы закранулі прадпрыемствы, створаныя грамадскімі аб'яднаннямі інвалідаў, — адзначыла парламентарый. — Сёння дзяржава ўкладвае значныя сродкі ў гэтыя прадпрыемствы, каб падняць іх на дастатковы ўзровень. Аднак мы робім і іншае: ствараем прадпрыемствы, якія выпускаюць такую ж прадукцыю, што і прадпрыемствы, створаныя арганізацыямі інвалідаў. Сёння апошнія не могуць канкурыраваць у роўных умовах. Прадукцыйнасць працы інваліда і здаровага чалавека адрозніваецца. Я хачу звярнуць вашу ўвагу на гэтае складанае пытанне. У маёй акрузе два падобныя прадпрыемствы, і яны сёння адчуваюць цяжкасці.

— Нядаўна ў Гродне мы правялі пасяджэнне міжведамаснага савета па праблемах інвалідаў, наведвалі такое прадпрыемства, — паведаміла Наталля Качанава. — Першае пытанне, якое было разгледжана — менавіта праца такіх прадпрыемстваў па выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі і яе прасоўванне на рынку нашай краіны. Гэтае пытанне ва ўрадзе ўзялі пад кантроль. Што да прэферэнцый для такіх прадпрыемстваў, то яны ёсць, і дастаткова неблагія.

СІТУАЦЫЯ Ў ЭКАНОМІЦЫ ПАЛЕПШЫЦЦА ЎЖО Ў ГЭТЫМ КВАРТАЛЕ

У гутарцы з журналістамі **міністр эканомікі Уладзімір ЗІНОЎСКІ** паведаміў, што яго ведамства прагназуе паляпшэнне эканамічнай сітуацыі ў III квартале бягучага года:

— Ідзе напрацоўка розных схем, у тым ліку ў прамысловасці. Будзем атрымліваць сельскагаспадарчую прадукцыю новага ўраджаю.

Паводле яго слоў, адной з галоўных задач застаецца зніжэнне інфляцыі, якая «павінна ўтрымацца ў зададзеных рамках — прыкладна 16% у гадавым вылічэнні».

Пры гэтым Уладзімір Зіноўскі выключыў магчымасць уключэння грашовага станка. «Пустых» грошай ніхто ў эканоміку пускаць не будзе. Калі ёсць моцны акупны праект, урад і банкі будуць адшукваць сродкі. Такія галіны, як будаўніцтва, сельская гаспадарка, крэдытуюцца на зваротнай аснове. Атрымалі раней крэдыты — вернеце, потым атрымаеце новыя крэдыты», — растлумачыў ён.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ГАЛОЎНАЯ МЭТА — КЛОПАТ АБ ЧАЛАВЕКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З улікам даволі складанай сітуацыі ў эканоміцы распрацоўку праекта Праграмы трэба весці па пакетным прынцыпе, уключаючы неабходныя законы, указы, праграмы, пастановы або хаця б вызначыць іх пералік, канкрэтныя тэрміны прыняцця і канцэптуальную сутнасць. Такая «дарожная карта» дасць магчымасць арганізавана пачаць рэалізацыю намечаных задач з пачатку 2016 года. Асобныя найбольш актуальныя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгламентуюць сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны ў новых умовах, можна было б прыняць ужо на асенняй сесіі Савета Рэспублікі ў 2015 годзе.

Лічу правільнымі і заслугоўваючымі падтрымкі парламентам прапановы ўрада аб неабходнасці комплексных інстытуцыянальных змяненняў і ўдасканалення эканамічнай палітыкі. Пры гэтым дзяржава павінна садзейнічаць развіццю і павышэнню канкурэнтаздольнасці як цяпер эфектыўна працуючых прадпрыемстваў, так і стварэнню новых арганізацый. Дзяржаўных і прыватных, у тым ліку з замежным капіталам. Ход рэформ будзе паспяховым, калі пераўтварэнні будуць комплекснымі, усебакова прадуманымі, паслядоўна і актыўна рэалізаванымі. Члены Савета Рэспублікі, як мы дамовіліся раней, ужо ўносяць прапановы па стымуляванні занятасці, экспарце, інвестыцыйнай дзейнасці, а гэта сёння самыя актуальныя пытанні. Сур'ёзны інтарэс уяўляюць меры па абароне інтарэсаў нацыянальных таваравытворцаў, рэфармаванні кіравання.

Савету Рэспублікі трэба будзе весці актыўную і, я сказаў бы, напорыстую работу па гарманізацыі (супастаўнасці) і ўніфікацыі (ідэнтычнасці) нацыянальнага заканадаўства з улікам членства Беларусі ў ЕАЭС. Як былі шматлікія бар'еры ва ўзаемным гандлі паміж дзяржавамі — членамі ЕАЭС, так і застаюцца. Занепакоенасць выклікаюць новыя рашэнні, якія прымаюцца нашымі партнёрамі па Еўразійскім эканамічным саюзе ў аднабаковым парадку, што не ўмацоўвае наш саюз і цяпер, і на перспектыву. Хацелася б большай рэзультатыўнасці ў рабоце Еўразійскай эканамічнай камісіі па стварэнні паўнацэннага агульнага рынку без выключэнняў і абмежаванняў. Умовы гаспадарання неаднолькавыя, і часам нашы прадпрыемствы сутыкаюцца з-за гэтага на адзінай эканамічнай прасторы з жорсткай і нядобрасумленнай канкурэнцыяй. Для Савета Рэспублікі, як і Палаты прадстаўнікоў, ва ўрэгуляванні названых пытанняў ёсць аб'ектыўныя цяжкасці, пакольк і ў ЕАЭС парламенцкае вымярэнне адсутнічае. Але гэта не значыць, што сенатары павінны сядзець склаўшы рукі. Пад ляжачы камень вада не бяжыць. Ёсць розныя формы работы і іх трэба выкарыстоўваць. У міжсесійны перыяд кіраўніцтва пастаянных камісій будзе гэтым займацца.

Паважаныя калегі!

Міжнародная і міжпарламенцкая дзейнасць Савета Рэспублікі накіравана на стварэнне лепшых знешнепалітычных і знешнеэканамічных умоў для пашырэння і абароны нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь.

Безумоўным прыярытэтам у нашай міжнароднай дзейнасці з'яўляецца ўмацаванне стратэгічнага партнёрства з Расійскай Федэрацыяй.

З сакавіка 2015 года на пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы былі зацверджаны Прыярытэтныя напрамкі і першачарговыя задачы далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы на сярэднетэрміновую перспектыву (2014—2017 гады). Старшыням пастаянных камісій сумесна з калегамі з Палаты прадстаўнікоў неабходна з улікам гэтых рашэнняў фарміраваць планы законапраектнай дзейнасці.

Цяпер у Савеце Рэспублікі вядзецца мэтанакіраваная работа па падрыхтоўцы і правядзенні другога Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбудзецца 17-18 верасня 2015 года ў Вялікім Ноўгарадзе, асноўная тэматыка якога «Прамысловая палітыка Саюзнай дзяржавы: агульныя падыходы і рэгіянальныя аспекты».

Пляцоўку форуму неабходна выкарыстоўваць для вырашэння з расійскімі партнёрамі канкрэтных праблем і першачарговых задач развіцця прамысловай кааперацыі, аб'яднання прамысловага, фінансавага і маркетынгавага патэнцыялаў. Аргкамітэт форуму працуе над падрыхтоўкай рэгіянальных пагадненняў і камерцыйных кантрактаў. З улікам магчымасцей Еўразійскага эканамічнага саюза.

Па выніках даволі плённых візітаў прэзідэнтаў Кітая і Індыі, кіраўнікоў парламентаў Інданезіі, Сербіі, М'янмы ў Савеце Рэспублікі прыняты адпаведныя дакументы. Задача пастаянных камісій, Сакратарыята Савета Рэспублікі — забяспечыць іх безумоўную рэалізацыю.

Паважаныя таварышы!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка пастаянна ўказвае на тое, што ўся наша работа павінна быць накіравана на павышэнне дабрабыту нашых грамадзян, вырашэнне актуальных задач простага чалавека. Члены Савета Рэспублікі павінны пастаянна кіравацца гэтымі падыходамі ў сваёй дзейнасці.

Аналіз зваротаў сведчыць, што ў цэнтры ўвагі грамадзян прадаўжае знаходзіцца заканатворчая дзейнасць парламента. Члены Савета Рэспублікі, якія працуюць у рэгіёнах, разгледзелі 1800 вусных і пісьмовых зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, правялі 168 асабістых прыёмаў грамадзян (у тым ліку больш за 60 выязных), у ходзе якіх прынята амаль 600 чалавек. Работа будзе працягнута. На сістэмнай аснове, у цесным кантакце з кіраўнікамі рэгіёнаў і прадпрыемстваў, што і прадугледжана ў Пастанове Прэзідыума Савета Рэспублікі «Аб дадатковых мерах па павышэнні эфектыўнасці работы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з насельніцтвам», якая прынята ў студзені 2015 года.

У бліжэйшыя месяцы пад кіраўніцтвам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на спецыяльных шырокіх форумах будуць разгледжаны пытанні аграпрамысловага комплексу, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і адукацыі. З нашым, Савета Рэспублікі, удзелам. Таму я звяртаюся да членаў Савета Рэспублікі — абмяркуйце гэтыя пытанні ў сябе ў абласцях, парайцеся з Саветамі базавага ўзроўню. З чым прадстаўнікі рэгіёнаў прыбудуць на гэтыя сур'ёзныя мерапрыемствы?

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Напярэдзе ў нас важная палітычная падзея — выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Напярэдадні выбарчай кампаніі неабходна больш эфектыўна працаваць членам Савета Рэспублікі, дэпутатам мясцовых Саветаў дэпутатаў. Не чакаць даручэнняў, а быць актыўнымі ў вырашэнні праблем простых людзей і арганізацый.

Калі наш Прэзідэнт, паважаны Аляксандр Рыгоравіч, гаворыць, што выбары — гэта экзамен улады перад народам, мы, члены Савета Рэспублікі, павінны разумець, што гэта наш агульны экзамен. Сустрэчы з людзьмі, актывам, кіраўнікамі ўсіх узроўняў павінны праходзіць адкрыта, сумленна. Тады насельніцтва з яшчэ большай актыўнасцю падтрымае праводзімы ў краіне сацыяльна-палітычны і эканамічны курс.

(Заключная частка)

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Усе пытанні, унесеныя ў парадак дня гэтай сесіі, разгледжаны. Мы прынялі ва ўстаноўленым парадку рашэнне па ўсіх законапраектах, якія былі прадстаўлены Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

На што хачу звярнуць увагу, паважаныя калегі?

Нягледзячы на тое, што ўсе законапраекты ўхвалены, гэта не значыць, што няма, як кажуць у школе, заданняў на лета. Трэба сур'ёзна напрацоўваць матэрыял згодна з планам законапраектнай дзейнасці, зацверджаным Прэзідэнтам краіны на 2015 год, і рыхтаваць пакет нарматыўных прававых актаў пад Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 — 2020 гады.

Паважаныя таварышы!

За перыяд работы дзявятай сесіі Саветам Рэспублікі ўхвалена 62 законы, прыняты да ведама, а значыць, таксама ўхвалена 4 дэкрэты і 10 іншых актуальных дакументаў. За гэты мі скупымі лічбамі напружаная праца і адказнасць членаў Савета Рэспублікі і асабліва старшыняў пастаянных камісій. Я думаю, дарэчы падзякаваць ім за гэта.

Калі мы гаворым пра Савет Рэспублікі як пра палату парламента тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, то ўсім трэба мець на ўвазе, што гэта тычыцца не толькі прынцыпу абрання ў сенат. Гэта велізарная адказнасць за становішча спраў у рэгіёне, за рашэнне задач людзей, прадпрыемстваў у вашых абласцях і г. Мінску. Дадатковая адказнасць ляжыць на членах Савета Рэспублікі, прызначаных Прэзідэнтам краіны. Член Савета Рэспублікі павінен быць актыўным байцом у вырашэнні палітычных і сацыяльна-эканамічных задач, якіх шмат, але сёння прыярытэт — гэта выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і паспяховая работа эканомікі ў завяршальным годзе пяцігодкі.

Аб інструментах і механізмах нашай работы. Яны разнастайныя. Але два з іх галоўныя: заканатворчасць і праца з насельніцтвам. Прычым па другім у нас, згодна з заканадаўствам, ёсць вельмі добрыя магчымасці. Гэта мясцовыя Саветы дэпутатаў і 19,5 тысячы актыўных і прафесійна падрыхтаваных людзей — дэпутатаў.

16 студзеня 2015 з трыбуны Савета Рэспублікі Прэзідэнт краіны А.Р. Лукашэнка даручыў нам задзейнічаць гэты велізарны патэнцыял. Мэтанакіраваная праца вядзецца. Але, паважаныя калегі, мы не абудзілі цалкам мясцовыя Саветы, не перабудавалі іх працу ў канкрэтнае рэчышча, не ліквідавалі фармалізм і павярхоўны падыход. Рашэнне гэтых задач на нашым сумленні. Менавіта праз мясцовыя Саветы можна і трэба дайсці да кожнага чалавека, выбаршчыка, ведаць, чым ён жыве, у чым мае патрэбу, і дапамагчы вырашыць яго чалавечыя праблемы.

У зале старшыні абласных і Мінскага гарадскога Саветаў. Зрабіце правільныя высновы, не чакайце даручэнняў. Вам да ўсяго павінна быць справа: і да пустых дамоў у вёсках, у чым пойдуць 1 верасня ў школу дзеці з непаспяховых сем'яў, чаму ў асобных паліклініках чысціня і парадак, медперсанал прыветлівы, а ў іншыя заходзіць не хочацца.

Праца дэпутата — гэта твар улады.

Паважаныя таварышы!

Сёння, як і раней, у краіне маса актуальных пытанняў. Але я хацеў бы звярнуць вашу ўвагу на тры з іх:

— занятасць;

— экспарт;

— інвестыцыі.

Раней занятасць, магчымасць знайсці працу не з'яўлялася праблемай. Цяпер гэта дастаткова актуальнае пытанне. Члены Савета Рэспублікі, дэпутаты ўсіх узроўняў павінны самым актыўным чынам садзейнічаць стварэнню працоўных месцаў. Кажуць, што чалавека прымусіць працаваць можа страх і голад. Я не падзяляю гэты максімалісцкі падыход. Давайце кіравацца іншым: дзяржава, а значыць і мы, заканадаўцы, павінны стварыць умовы, пры якіх чалавек зможа працаўладкавацца і ўтрымліваць сябе і сваю сям'ю.

Экспарт — гэта лёс эканомікі. У нас экспарт — гэта прадукцыя апрацоўчай прамысловасці, у тым ліку сельскагаспадарчай перапрацоўкі. Будзе экспарт — будзе і прыбытак, і стабільны беларускі рубель. Дэпутаты, члены Савета Рэспублікі абавязаны прасоўваць беларускія тавары на экспарт, а гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі гэтыя тавары якасныя і канкурэнтаздольныя па цане.

На мінулым пасяджэнні я сказаў, што інвестара (усё роўна, айчыннага або замежнага) трэба любіць. Так, менавіта так! Таму што інвестыцыі — гэта развіццё, гэта будучыня.

Паважаныя калегі!

Прэзідэнт нашай краіны, паважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, эфектыўна і мэтанакіравана праводзіць палітыку павышэння дабрабыту беларускага народа, абароны інтарэсаў Рэспублікі Беларусь. Цяпер мы, члены Савета Рэспублікі, яшчэ з большай актыўнасцю абавязаны вырашаць ускладзеныя на нас задачы.

Дазвольце пажадаць вам, паважаныя члены Савета Рэспублікі, здароўя, поспехаў, актыўнай жыццёвай пазіцыі.

Да сустрэчы восенню!

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У адпаведнасці з артыкулам 95 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзявятую сесію Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання аб'яўляю закрытай.

КУРСАМ НА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЭКАНАМІЧНАЙ І САЦЫЯЛЬНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэтай жа мэце была падпарадкавана і ратыфікацыя большасці міжнародных пагадненняў, якія заклалі аснову доўгатэрміновых адносін з новымі партнёрамі.

Патрабаванне кіраўніка дзяржавы па-гаспадарску, дбайна выкарыстоўваць унутраныя рэсурсы стала для дэпутатаў зыходным пунктам пры разглядзе эфектыўнасці расходавання сродкаў рэспубліканскага бюджэту і дзяржаўных пазабюджэтных фондаў у 2014 годзе. З такіх жа пазіцый трэба падысці да распрацоўкі бюджэтнай палітыкі і стратэгіі развіцця краіны на перспектыву.

На сесіі знайшлі сваё адлюстраванне інавацыйныя падыходы да развіцця сельскай гаспадаркі і будаўнічай сферы. Значнае месца было адведзена экалагічнай праблематыцы, эфектыўнаму выкарыстанню прыродных рэсурсаў, пытанням прамысловай бяспекі, абыходжанню з адходамі.

Рэалізуючы тэзіс паслання аб павышэнні якасці законаў, дэпутаты асаблівую ўвагу надалі прагнозу вынікаў іх прыняцця.

Прадметам дэталёвага аналізу пастаянных камісій з удзелам спецыялістаў, экспертаў і шырокай грамадскасці сталі актуальныя пытанні ў сферах лесакарыстання, энергетыкі, гандлю і грамадскага харчавання. У мэтах вывучэння правапрымяняльнай практыкі адбыўся змястоўны семінар па пытаннях функцыянавання ўстаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы.

Аднак стан спраў у эканоміцы перш за ўсё залежыць ад самога чалавека, яго ініцыятывы і стаўлення да працы. Менавіта гэтым прадыктаваны прынятыя намі меры па стымуляванні дзелавой актыўнасці і аптымізацыі працоўных адносін. З улікам няпростай эканамічнай сітуацыі асаблівы акцэнт быў зроблены на развіццё рынку працы, забеспячэнне занятасці насельніцтва, прыцягненне ў Беларусь кваліфікаваных спецыялістаў.

Вялікі пакет разгледжаных законапраектаў звязаны з удасканаленнем сфер аховы здароўя і адукацыі, пенсійнага забеспячэння і дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, фізкультуры і спорту. Вырашэнне гэтых пытанняў у сучасных умовах запатрабавала асаблівай адказнасці, паколькі менавіта ўзровень аказання медыцынскіх, адукацыйных і іншых сацыяльных паслуг з'яўляецца найважнейшым крытэрыем якасці жыцця.

У ходзе сесіі пачата маштабная работа над праектам Кодэкса аб культуры. Гэта ўнікальны дакумент, які не мае аналагаў у СНД. І, зразумела, яго падрыхтоўка будзе весціся з улікам шырокага грамадскага меркавання. Прарыстасць заканадаўчага працэсу і адкрыты дыялог — важная ўмова актыўнага ўдзелу людзей у жыцці дзяржавы.

Шэраг заканадаўчых актаў непасрэдна звязаны з фарміраваннем адказнай грамадзянскай пазіцыі насельніцтва. Гэта датычыцца ўдзелу грамадскасці ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў, мер па дэбюракратызацыі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

Асаблівае гучанне набывае ў гэтых адносінах прэзідэнцкі Закон «Аб барацьбе з карупцыяй», у якім замацавана новая форма процідзеяння карупцыі — грамадскі кантроль. Менавіта так, усім разам, трэба змагацца з гэтым злом, якое наносіць непапраўны ўрон эканоміцы і падрывае давер грамадзян да ўлады.

На сесіі была прадоўжана сістэмная работа па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі, законнасці і правапарадку. Важкі блок дакументаў датычыцца пытанняў рэфармавання судовай сістэмы, прарыстасці ў рабоце праваахоўных органаў, заснавання інстытута альтэрнатыўнай службы. Чарговы крок у гуманізацыі нацыянальнага заканадаўства — прыняцце Закона аб амністыі. Ён прызначаны даць грамадзянам, якія зрабілі памылку ў жыцці, але сталі на шлях выпраўлення, магчымасць пачаць новае жыццё.

У перыяд сесіі рэалізавана вельмі інтэнсіўная міжнародная праграма. Нам удалося значна рушыць наперад ва ўмацаванні ўжо наладжаных і ўстанаўленні новых кантактаў, вызначэнні больш эфектыўных форм супрацоўніцтва.

Нарошчванню супрацоўніцтва з такімі гігантамі, як Індыя і Кітай, напаўненню яго новым зместам паслужылі візіты лідараў гэтых дзяржаў у нашу краіну.

Можна таксама з поўным правам сцвярджаць, што ўпэўнена набірае абароты дыялог з дзяржавамі Паўднёва-Усходняй Азіі. Сведчанне таго — насычанасць праграм знаходжання ў Беларусі афіцыйных парламенцкіх дэлегацый Інданезіі і М'янмы.

На якасна новы ўзровень выйшлі адносіны з нашымі казахстанскімі калегамі. Зусім нядаўна ў горадзе Астане мы падпісалі Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Палатай прадстаўнікоў і Мажылісам Парламента Казахстана. У час візіту мы змаглі наглядна пераканацца, што намаганні парламентарыяў па развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, прамысловай кааперацыі, стварэнні прадпрыемстваў даюць значны вынік. Беларуская дэлегацыя дала сімвалічны старт пачатку будаўніцтва завода па вытворчасці тэхнікі на базе шасі Мінскага аўтамабільнага завода.

Гаворачы аб еўрапейскім вектары супрацоўніцтва, не магу не адзначыць значэнне візіту старшыні Народнай скупшчыны Рэспублікі Сербія. Гэта адбылося ўпершыню за ўсю гісторыю нашых міжпарламенцкіх адносін, і мемарандум, які быў падпісаны па выніках візіту, па сутнасці, стаў зыходным пунктам у распрацоўцы «дарожнай карты» па выхадзе беларуска-сербскага супрацоўніцтва на стратэгічны ўзровень.

Шырокі спектр пытанняў міжнароднага парадку дня вырашаўся пры актыўным удзеле беларускіх дэпутатаў на пляцоўках міжнародных парламенцкіх арганізацый. Лейтматывам гэтай дзейнасці ў бягучым годзе стала аб'яднанне намаганняў парламентарыяў у барацьбе за мір на планеце, захаванне гістарычнай памяці.

Асаблівую салідарнасць з намі ў гэтай рабоце выказалі нашы калегі — дэпутаты МПА СНД, ПА АДКБ, Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Літаральна гэтымі днямі ў горадзе Гродне прайшла 48-я сесія Парламенцкага сходу, дзе нараўне з абмеркаваннем перспектыў саюзнага будаўніцтва прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Вялікай Перамозе. Гэта Перамога — наш агульны здабытак, і наш абавязак — не дапусціць фальсіфікацыі гісторыі і забыцця ўрокаў вайны.

Важнай вяхой у развіцці адносін з АБСЕ і яе Парламенцкай асамблеяй сталі сустрэчы кіраўніцтва Палаты прадстаўнікоў з генеральным сакратаром гэтай аўтарытэтнай арганізацыі, намеснікам старшыні ПА АБСЕ і дырэктарам Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека.

І гэта далёка не поўны пералік праведзеных міжнародных мерапрыемстваў. Ужо цяпер відавочна — вынікі многіх з іх адкрываюць шырокія перспектывы не толькі для парламенцкай дыпламатыі, але і для рэалізацыі знешнепалітычнага курсу краіны ў цэлым.

Паважаныя дэпутаты!

У міжсесійны перыяд нас чакае не менш адказная і напружаная работа па ўсіх напрамках парламенцкай дзейнасці. Парадак дня будучых міжнародных і заканатворчай праграм даволі аб'ёмны.

Сёння намі прынята важнае палітычнае рашэнне — назначана дата выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Парламентарыі заўсёды былі сілай, якая кансалідуе грамадства ў адказныя для краіны перыяды. І ў гэтым палітычным сезоне мы павінны зрабіць усё, што ад нас залежыць, каб выбарчая кампанія прайшла максімальна адкрыта, дэмакратычна, у поўнай адпаведнасці з законам, а яе вынікі сталі рэальным выяўленнем волі народа, адпавядалі яго інтарэсам.

Упэўнены — вопыт, прафесіяналізм і актыўная грамадзянская пазіцыя, уласцівыя дэпутатам, дадуць магчымасць паспяхова выканаць усе пастаўленыя задачы.

На заканчэнне, паважаныя калегі, дазвольце падзякаваць вам за работу і павіншаваць усіх прысутных з надыходзячым святам — Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Жадаю вам моцнага здароўя, поспеху, шчасця і новых здзяйсненняў на карысць Радзімы.

«КАНДЫДАТУ ПАВІННЫ БЫЦЬ АБАВЯЗКОВА ЎЛАСЦІВЫ ДЗВЕ ЯКАСЦІ — РОЗУМ І СУМЛЕННАСЦЬ»

Лідзія Ярмошына — аб патэнцыяльных кандыдатах у прэзідэнты, зборы подпісаў і відэаназіранні на ўчастках

Палата прадстаўнікоў на заключным пасяджэнні сёмай сесіі падтрымала прапанову ЦВК аб назначэнні даты выбараў Прэзідэнта Беларусі — яны пройдуць у нашай краіне 11 кастрычніка. Па гарачых слядах праведзенага пасяджэння карэспандэнт БЕЛТА паразмаўляла са старшынёй Цэнтрвыбаркама Лідзіяй ЯРМОШЫНАЙ. Самыя цікавыя фрагменты інтэрв'ю прапануюцца вашай увазе.

— Лідзія Міхайлаўна, многія цікавяцца, чаму ўсё ж такі было вырашана назначыць больш раннюю дату выбараў, чым гэта планавалася?

— Адразу хачу чарговы раз падкрэсліць: ні аб якім пераносе даты размовы не ідзе, таму што ніхто дату не назначаў. 15 лістапада — гэта была магчымая дата, якая планавалася Цэнтральнай выбарчай камісіяй. Пасля кансультацыі з усімі зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, якія будуць задзейнічаны пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў (урад, парламент, мясцовая вертыкаль) было прынята рашэнне аб іх планаванні на больш ранні тэрмін. Прычым з пункту гледжання закона той тэрмін, аб якім мы гаворым цяпер (11 кастрычніка. — **БЕЛТА**), больш пажаданы, паколькі ён дае магчымасць у выпадку правядзення другога тура ўкласці ўсю выбарчую кампанію ў рамкі, акрэсленыя законам і Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, і не выйсці пры гэтым за межы двухмесячнага тэрміну, які павінен абавязкова захоўвацца паміж датай выбараў і заканчэннем тэрміну паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы. Таму ўсё робіцца ў рамках закона. Выбары не з'яўляюцца датэрміновымі, яны маглі б праходзіць у любы дзень да 15 лістапада.

— Паводле вашых прагнозаў, колькі ініцыятыўных груп будзе зарэгістравана? Колькім з іх удасца сабраць 100 тыс. подпісаў і зарэгістраваць свайго кандыдата?

— Мне цяжка сказаць, таму што цяпер заяўляе аб сабе шэраг будучых прэтэндэнтаў. Спадзяюся, што іх будзе хаця б не менш за пяць. У выбаршчыкаў павінен быць выбар, таму што ў выпадку, калі не ажыццяўляецца палітычная барацьба і няма канкурэнцыі на выбарах (тым больш — прэзідэнцкіх), выбаршчыкі адчуваюць пэўнае расчараванне, што ўплывае на іх яўку на ўчастках.

— Некаторыя палітычныя сілы Беларусі ўжо абвінавачваюць сваіх апанентаў у тым, што тыя не збіраюць подпісы рэальна, а «перапісваюць тэлефонны даведнік». Наколькі абгрунтаваныя такія прэтэнзіі?

— Магчыма, гэта мае месца быць, але калі нашы тэрытарыяльныя камісіі не ўстанавілі такіх фактаў, я не магу з гэтым пагадзіцца. Адзіны кур'ёзны выпадак быў у час выбараў 2010 года, калі адзін з патэнцыяльных кандыдатаў проста купіў або запазычыў у нейкай групы падпісныя лісты, адксеракапіраваў іх і здаў копіі. Але такое парушэнне адразу кідаецца ў вочы. Што датычыцца тэлефонных даведнікаў, то ў гэтым выпадку парушэнне можна ўстанавіць толькі пры дапамозе праверкі: выезду на месца, размовы з грамадзянамі, якія трапілі ў падпісныя лісты. Тэрытарыяльныя камісіі павінны праверыць не менш як 20 працэнтаў подпісаў ад агульнай колькасці тых, што былі здадзены ў кожным раёне. Раней такіх фактаў мы не ўстанавілі. Гэта па-першае. Па-другое, у тэлефонным даведніку, вядома, можна ўзяць прозвішчы з адрасамі, а пашпартныя даныя, якія абавязкова павінны быць абазначаны ў падпісным лісце? Іх жа з тэлефоннага даведніка не возьмеш. Таму я думаю, што сцвярджэнне, якое вы згадалі, не з'яўляецца сапраўдным.

— Пагаворым аб замежных назіральніках на маючых адбыцца выбарах. Нядаўна стала вядома, што ўжо ў другой палове ліпеня да нас могуць прыбыць прадстаўнікі АБСЕ — у складзе місіі па ацэнцы патрэбнасцей па арганізацыі назірання за прэзідэнцкімі выбарамі. Акрамя таго, у адным са сваіх выступленняў вы гаварылі, што да нас для ўдзелу ў маніторынгу ўсімі фібрамі сваёй душы імкнуцца прадстаўнікі Савета Еўропы...

— Прынамсі, тыя дакладчыкі па Беларусі, якія наведвалі нашу краіну напярэдадні выбараў, выказалі пажаданне прыняць удзел у маніторынгу. І калі такое запрашэнне будзе накіравана (а як мяркуецца, яно будзе накіравана), то гэта можна лічыць вельмі прыгожым і добрым жэстам з боку Беларусі. Думаю, трэба яго зрабіць. Адзінае, ці будзе ён па заслугах ацэнены... Ведаеце, гэта, зноў-такі, справа палітычнага сумлення тых, хто пасля можа праявіць неаб'ектыўнасць або варожасць у абмен на гэты жэст.

— Хацелася б пачуць ад вас таксама пару слоў аб новаўвядзеннях па арганізацыі работы ЦВК і галасаванні на выбарах гэтай восенню. Як паспелі ўжо заўважыць многія, працуе новы сайт Цэнтрвыбаркама, дзе ў тым ліку ёсць версія для людзей са слабым зрокам. Дарэчы, не раз ужо гаварылася аб тым, што людзі са слабым зрокам цяпер змогуць галасаваць на ўчастках без чужой дапамогі, і гэта, несумненна, вялікі плюс. Цікава, як у нас ідуць справы з укараненнем сістэмы відэаназірання на выбарчых участках? Раней вы казалі пра яе без асаблівага энтузіязму.

— Відэанагляд — не больш чым іміджавы элемент, які з пункту гледжання назірання за выбарамі амаль нічога не дае. У чым яго сутнасць? У тым, каб любы грамадзянін, седзячы дома, мог выйсці на пэўны сайт і з дапамогай камп'ютара паглядзець, якім чынам ажыццяўляецца, напрыклад, падлік галасоў на тым участку, дзе ён прагаласаваў. Магчыма, у адзінкавай колькасці такія грамадзяне знойдуцца. Пагаджуся, што калі ўзяць адзін участак і сканцэнтравацца на ім, можна што-небудзь (хоць і з цяжкасцю) разгледзець. Але паглядзець і ўбачыць, што адбываецца на шасці тысячах участкаў, нават калі вывесці карцінкі ў асобныя «іконкі», немагчыма. Атрымліваецца шматслойная, зусім незразумелая мазаіка. Дарэчы, я бачыла, як гэта робіцца ў Азербайджане. Па-мойму, там толькі 15 працэнтаў участкаў забяспечаны відэакамерамі. У выніку атрымліваецца наступнае: сядзіць вялікая колькасць супрацоўнікаў Цэнтрвыбаркама, якія спрабуюць што-небудзь разгледзець, але гэта практычна нерэальна. Можна, вядома, павялічыць карцінку, але дзе гарантыя, што ты павялічыў яе менавіта ў той момант, калі адбылося, напрыклад, укідванне бюлетэняў?

